Дзіцячы садок для састарэлых, школьны аўтобус для гараджан і еўрадровы па заяўцы

Што робіць жыццё ў аграгарадку яшчэ больш прывабным? Аб гэтым даведаліся ўдзельнікі семінара, што прайшоў у Віцебскім раёне. На яго запрасілі абраннікаў, старшынь Саветаў дэпутатаў першаснага ўзроўню, якія абмяркоўвалі работу органаў мясцовага кіравання і самакіравання па вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва. І ў выкананні сацыяльных стандартаў у раёне, а канкрэтна ў Варонаўскім сельсавеце, многае зроблена. Тут можна многаму навучыцца. Напрыклад, вопыту бездатацыйнай работы, аказанню паслуг насельніцтву, добраўпарадкаванню тэрыторый...

НАВАСЕЛЛІ НА БЫЛЫМ ПОЛІ

Напачатку ўдзельнікам семінара паказалі катэджы, дзе справілі наваселлі мясцовыя жыхары і грамадзяне, якія купілі зямлю пад будаўніцтва на аўкцыёнах.

Віктар ДАРОЖКІН, старшыня Віцебскага раённага Савета дэпутатаў, і Юрый Восіпаў, старшыня Варонаўскага сельсавета расказалі пра квартал індывідуальнай забудовы. Раней тут было поле. Мясцовая ўлада некалькі гадоў таму прыняла рашэнне выкарыстаць гэтую зямлю пад будаўніцтва жылля. Прыярытэт, канешне, быў аддадзены вяскоўцам, якія мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. І пяцьдзясят сем'яў атрымалі права зрабіць гэта. Яшчэ больш за трыццаць участкаў прадалі з малатка. Попыт быў вялікі, бо недалёка Віцебск, ды і аграрны гарадок Вароны вельмі ўтульны для пражывання. Тут ёсць усе выгоды.

Наогул, тут з'явілася добрая тэндэнцыя: насельніцтва ў Варонах павялічваецца. Калі ў 2010-м у аграгарадку было каля 580 жыхароў, цяпер тут жывуць пад 760 чалавек. Ствараюцца сем'і, нараджаюцца дзеці, вёска жыве.

Цікава, што ў школу, дзе навучаецца каля 120 школьнікаў, ходзяць таксама дзеці з Лёзненскага раёна. І нават з Віцебска! Апошняе трохі здзіўляе. Як высветлілася, у новым спальным раёне абласнога цэнтра існуе праблема з тым, каб стаць вучнем школы ў «крокавай даступнасці». А да Варон некалькі кіламетраў, ды і школьны аўтобус з гарадка праязджае праз горад...

БЕЗ ПРАБЛЕМ З РАЗМЯШЧЭННЕМ

А ў Варонаўскім доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў расказалі пра тое, як годна можна жыць у дзяржаўнай установе сацыяльнага абслугоўвання. У пакоях — па адным або два чалавекі. Ёсць магчымасць не горш, чым у краінах ЕС, прайсці курсы рэабілітацыі, рэлаксацыі і гэтак далей. Напрыклад, ёсць блок водных працэдур.

Нярэдка, дзякуючы клопату персаналу, тыя, хто былі прыкаваныя да ложка, пачынаюць самастойна выязджаць на калясках на вуліцу і нават хадзіць. Працягласць жыцця ў інтэрнаце большая ў параўнанні з той, што ў састарэлых, якія жывуць дома.

Зімой тут ахвотна часова знаходзяцца тыя, у каго сваякі далёка або іх няма зусім. Можна пабыць і дзень, бо аказваецца адпаведная паслуга. Яна вядомая як «Дзіцячы садок для састарэлых».

Аналагічная практыка і ў іншых установах Віцебшчыны. Праблем з размяшчэннем тых, хто пажадае, у інтэрнаты няма ва ўсёй вобласці.

Дэпутатам расказалі пра тое, што зроблена для добраўпарадкавання тэрыторыі. Такое не сорамна паказаць іншаземцам. Ды ім, дарэчы, тут могуць даць майстар-клас таго, як пры параўнальна невялікіх выдатках, але з фантазіяй зрабіць цуд.

КУП ПРАЦУЕ І НА ЭКСПАРТ

Пра камунальнае ўнітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «Вароны-сэрвіс» мы ўжо пісалі ў «МС». Нагадаю, тут, у прыватнасці, напрацавалі добры вопыт у знішчэнні баршчэўніку, наводзяць ідэальны парадак на вясковых могілках, ёсць іншыя кірункі дзейнасці.

Дэпутаты ўзялі «на карандаш» адпаведныя напрацоўкі. Для іх арганізавалі агляд тэхнікі, якая выкарыстоўваецца для аказання паслуг насельніцтву.

Усё больш заказчыкаў у КУП на так званыя еўрадровы: 1,6 куба акуратна складзенага драўлянага паліва прывязуць таму, хто мае патрэбу, акуратна складуць. Потым, як мовяць, толькі бяры і спальвай... У прадпрыемства ёсць свая піларама. Драўніну экспартуюць у краіны Прыбалтыкі і Галандыю.

Дарэчы, як канстатаваў **старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ,** такая плённая дзейнасць КУП — прыклад таго, што пры жаданні можна аказваць не толькі паслугі па сацыяльных расцэнках. Калі правільна арганізаваць дзейнасць, можна канкураваць з недзяржаўнымі структурамі, працаваць з прыбыткам.

Ён станоўча ацаніў тое, што робіцца мясцовай уладай, у тым ліку і ў пытаннях выканання сацыяльных стандартаў, работы з насельніцтвам.

— Поспех у тым, што ў раёне дасведчаныя кадры, плюс наладжанае эфектыўнае ўзаемадзеянне паміж галінамі ўлады і дзяржаўнымі ўстановамі... Зразумела, што раён — «уязныя вароты» ў Віцебск, і таму павінен з'яўляцца ўзорным, — адзначыў старшыня.

Ён стаў ініцыятарам таго, каб семінары па розных тэмах праводзіліся ў рэгіёнах, асобна ўзятых сельсаветах, дзе ёсць чаму павучыцца. Трэба толькі прыехаць, паглядзець на ўласныя вочы і ўзяць на ўзбраенне адпрацаванае на практыцы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЯК АТРЫМАЦЬ «ПРАВІЛЬНУЮ» ВАДУ?

Якасць жыцця залежыць ад розных фактараў, у ліку якіх і водазабеспячэнне

Многія сельскія жыхары занепакоены станам пітной вады. Аб гэтым сведчаць шматлікія звароты ў розныя інстанцыі. І работа ў гэтым кірунку вядзецца. На ўзроўні абласных улад зацверджаны праграмы добраўпарадкавання аграгарадкоў з улікам паляпшэння водазабеспячэння. Разам з тым выяўлена нямала фактаў неналежнай эксплуатацыі такіх аб'ектаў. У выніку пагаршаецца якасць вады, а нярэдка гэта прыводзіць і да аварыйных сітуацый.

Каб станцыі не выходзілі са строю

Санітарныя службы ажыццяўляюць пастаянны кантроль за якасцю вады. Як паказалі праверкі, мікрабіялагічныя паказчыкі нават ніжэйшыя за норму, што забяспечвае санітарна-біялагічную бяспеку. А вось па хімічным стане ёсць пытанні. Асабліва многа скаргаў ад насельніцтва на ржавую ваду. Як растлумачыў **намеснік галоўнага санітарнага ўрача Гродзенскай вобласці Аляксандр РУФКІН,** прыродная вада сама па сабе змяшчае жалеза, а пасля праходжання праз водаправоды ўтрыманне гэтага рэчыва яшчэ больш узрастае.

Палепшыць стан вады дапамагаюць станцыі абезжалезвання. Дзякуючы ім, за дзесяць гадоў у два разы знізіўся хімічны парог проб. У сельскай мясцовасці працуе 68 такіх станцый, яшчэ 58 запланавана пабудаваць на Гродзеншчыне да 2020 года. Кожны год уводзіцца ў строй 5-6 аб'ектаў.

Найбольш прыкра, што шэраг новых станцый не працуе. Сёлета зафіксавана восем аб'ектаў, якія выйшлі са строю. Удалося адрамантаваць палову, астатнія пакуль спынілі падачу вады, гэта значыць, што насельніцтву зноў паступае такая ж іржавая вада.

Не ўсе ўласнікі аб'ектаў сістэм пітнога водазабеспячэння (а гэта сельгаспрадпрыемствы і ЖКГ) належным чынам іх абслугоўваюць. Па словах Аляксандра Руфкіна, было абследавана амаль 640 водаправодаў — пітных і гаспадарчых. Санітарна-эпідэміялагічныя парушэнні ўстаноўлены на большасці камунальных і амаль на ўсіх ведамасных аб'ектах.

Занядбанымі можна назваць некалькі дзясяткаў свідравін. Хоць яны перададзены на баланс ЖКГ, парадак на іх так і не наведзены. Як санітарныя, так і тэхналагічныя нарматывы не выконваюцца.

У камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя выявілі праблемы з улікам вады на свідравінах, парушэнні правілаў эксплуатацыі пасялковых ачышчальных збудаванняў. Не ўсе прадпрыемствы маюць дазвол на карыстанне свідравінамі. Адсутнасць такога спецыяльнага дазволу цягне за сабой адміністрацыйную адказнасць. І такія справы разглядаліся з удзелам пракуратуры. Але пакуль 30 суб'ектаў гаспадарання з 450 карыстаюцца свідравінамі самавольна.

Далучыць да праблем мясцовыя ўлады

У Камітэце дзяржкантролю Гродзенскай вобласці агучылі такі факт: кожны трэці метр водаправода ў сельскай мясцовасці працуе больш за 30 гадоў. Сеткі даволі зношаныя, але не толькі яны. Маніторынг выявіў нездавальняючы стан аб'ектаў водазабеспячэння — свідравін, ачышчальных збудаванняў.

Як зазначыў **старшыня КДК Гродзенскай вобласці Анатоль ДАРОЖКА,** такі стан уплывае і на якасць вады, і на эканоміку. З-за гэтага летась у 10 раёнах адбыліся значныя страты вады, а ў некаторых яны даходзілі да 27 %. Зафіксавана амаль 80 аварый. Большасць з іх адбылася ў Смаргонскім, Дзятлаўскім, Карэліцкім, Зэльвенскім, Ваўкавыскім раёнах. На ліквідацыю аварый уласнікі трацяць значныя сродкі. Пры гэтым праграмы па замене зношаных сетак не існуе, работы вядуцца хаатычна. На думку Анатоля Дарожкі, трэба распрацаваць мерапрыемствы па замене водаправодаў у сельскіх населеных пунктах вобласці і на гэтыя мэты выдзяляць неабходныя сродкі. Пад канкрэтныя аб'екты — канкрэтнае фінансаванне. Гэту работу неабходна праводзіць з удзелам мясцовых улад — райвыканкамаў і сельскіх Саветаў, якія зацвердзілі б комплекс мерапрыемстваў па паляпшэнні сітуацыі.

Накіроўваць сродкі па прызначэнні

Генеральны дырэктар дзяржаўнага аб'яднання ЖКГ Гродзенскай вобласці Алег ШАФРАНСКІ растлумачыў: у камунальнікаў ёсць магчымасць палепшыць сітуацыю ўласнымі сіламі. Прыток фінансаў забяспечваюць высокія тарыфы за ваду. У вобласці насельніцтва плаціць за кубаметр вады 80 капеек, не хапае толькі чатырох капеек, каб поўнасцю «пагасіць» субсідыі. Але і гэта хутка адбудзецца. У згаданай цане прадугледжаны і адлічэнні за амартызацыю. У год яны складаюць амаль 10 мільёнаў рублёў. Такіх сродкаў магло б хапіць на перакладку 10 % водаправодаў. Але грошы не заўсёды ідуць на ўзнаўленне аб'ектаў, бо іх накіроўваюць на іншыя патрэбы. Напрыклад, у Карэліцкім раёне, дзе высокая аварыйнасць сетак, атрымліваюць амаль 100 тысяч у год такіх адлічэнняў, а правесці замену старых участкаў не могуць. Такая сітуацыя недапушчальная, лічыць Алег Шафранскі.

На яго думку, пытанне трэба вырашаць на ўзроўні дзяржавы. Ён адзначыў, што ўжо распрацоўваецца праект указа па стварэнні амартызацыйнага фонду. У гэты фонд будуць паступаць сродкі, якія не былі выкарыстаны па прызначэнні, у тым ліку і па аднаўленні сістэмы водазабеспячэння. Калі гаспадары сетак не правядуць такія работы, сродкі за амартызацыю пяройдуць у агульны фонд. Вось тут і патрэбна дапамога дэпутатаў, якія ўлічвалі б гэты факт пры размеркаванні бюджэту і наогул на месцах далучыліся б да мерапрыемстваў па падрыхтоўцы абласной праграмы добраўпарадкавання аб'ектаў водазабеспячэння і водаадвядзення.

Пакасіць траву, пафарбаваць і пачысціць ад смецця...

Навесці парадак можна і без асаблівых затрат. Праверкі дзяржкантролю паказалі, что шэраг аб'ектаў знаходзіцца ў занядбаным стане. Абсталяванне водазаборных свідравін не пафарбавана, яго раз'ядае ржа, люкі пашкоджаны, на санітарных зонах пасецца жывёла, тэрыторыя зарастае бур'яном. Факты сведчаць пра тое, што за важнымі воднымі аб'ектамі не вядзецца кантроль, што і прыводзіць да падобнага стану. А гэтыя работы не патрабуюць нейкіх сродкаў, хутчэй увагі. Трэба толькі арганізаваць сістэмную работу: своечасова абкошваць тэрыторыю, убраць смецце, пачысціць ад пылу і адключыць ад сеткі электраабсталяванне. У дзяржкантролі лічаць, што дэпутаты таксама павінны сачыць за парадкам на такіх аб'ектах і ўплываць на падтрыманне іх у добрым стане.

Маргарыта УШКЕВІЧ.